Источник: "Настаўніцкая газета" - 2012-11-27

# Пытанне "А што далей?" як прадмет экалагічнай культуры

**Днямі ў Рэспубліканскім эколага-біялагічным цэнтры прайшла рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя "Фарміраванне экалагічнай культуры асобы як педагагічнае ўзаемадзеянне: вопыт і перспектывы развіцця". Удзельнікамі форуму сталі 80 педагогаў, прадстаўнікі Міністэрства адукацыі, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, вучоныя, а таксама педагогі Эколага-біялагічнага цэнтра "Крастоўскі востраў" Санкт-Пецярбургскага гарадского палаца творчасці юных.**

►►► 4 стар.

Наталля Алёхіна. Пытанне «А што далей?» як прадмет эка

# Пытанне “А што далей?” як прадмет экалагічнай культуры

◄◄◄ 1 стар.

## Дзе мяжа паміж неразумным і разумным?

“Экалагічныя праблемы знаходзяцца ў цэнтры ўвагі ўсяго свету, — зазначыў першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Віталь Васільевіч Кулік. — Яны тычацца кожнага з нас. І пачынаць экалагічнае выхаванне трэба з самага ранняга ўзросту”.

Міжнародную канферэнцыю “Рыа+20”, арганізатарам якой з’яўляецца Арганізацыя Аб’яднаных Нацый, узгадаў у сваім выступленні доктар педагагічных навук прафесар Сяргей Сямёнавіч Кашлеў. 100 прэзідэнтаў і прэм’ер-міністраў краін свету наведалі яе. Гэта факт, які сам па сабе сведчыць пра важнасць праблем экалагічнага кірунку.

“Праблема, безумоўна, на слыху, але нейкіх значных змяненняў у гэтым кірунку не назіраецца, — падзяліўся сваім меркаваннем выступоўца. — Не так даўно мне пашчасціла ўдзельнічаць у міжнароднай канферэнцыі ў Маскве на тэму “Экалагічная культура ў глабальным свеце”, дзе таксама былі прадстаўлены практычна ўсе кантыненты. У прыватнасці, на ёй адзначалася, што мэты аб’яўленага дзесяцігоддзя экалагічнай адукацыі, якое хутка падыходзіць да свайго завяршэння, хутчэй за ўсё не будуць дасягнуты”.

Надзвычай актуальную тэму ўзняла на канферэнцыі Таццяна Віктараўна Мішаткіна, доктар філасофскіх навук і прафесар Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага ўніверсітэта імя А.Д.Сахарава. Яе выступленне было прысвечана нанасвету і экалогіі чалавека.



“Важна разумець, як нанатэхналогіі, пра якія мы так многа чуем, але дакладна не ведаем, у чым яны заключаюцца, уплываюць на прыроду і чалавека, — адзначыла прафесар Мішаткіна. — Як фарміраваць гатоўнасць чалавечай свядомасці да будучых змяненняў? Як будуць уплываць на наступныя пакаленні сучасныя дасягненні?

Сёння адной з найважнейшых праблем называюць праблему азбесту XXI стагоддзя. Як вядома, гэты матэрыял пасля яго маштабнага выкарыстання па ўсім свеце аказвае самае шкоднае ўздзеянне на органы дыхання чалавека. Падобны ўплыў на метабалізм усяго жывога аказваюць і нанаматэрыялы. Калі размова ідзе пра вытворчасць генетычна мадыфікаваных прадуктаў, мы ўжо не задумваемся над многім, мы прызвычаіліся. Але з кожным годам гаворка ідзе пра ўсё больш сур’ёзныя рэчы, якія, хутчэй, нагадваюць кадры з фантастычных фільмаў, у прыватнасці мэтанакіраваныя змяненні генетычнай, антрапалагічнай і сацыякультурнай ідэнтычнасці чалавека, якія мяняюць тыя нашы ўяўленні, якія яшчэ ўчора здаваліся непарушнымі.

Фізічная эвалюцыя чалавека скончылася тысячагоддзі назад, чалавек больш не мяняецца. Аказваецца, існуюць праекты, якія пры сваёй рэалізацыі дадуць новы штуршок эвалюцыі чалавека”.

У якасці аднаго з прыкладаў Таццяна Віктараўна прывяла распрацоўкі Інстытута генетыкі і цыталогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, дзе ажыццяўляецца “фарміраванне” людзей з выключна высокімі спартыўнымі магчымасцямі.

“У некаторых выпадках узнікае мноства этычных пытанняў, — лічыць прафесар Мішаткіна. — Ці заўсёды тое, што можа рабіць чалавецтва, яно павінна і мае права рабіць? Напрыклад, сёння самым “модным” нанапрэпаратам з’яўляецца нанасерабро, паколькі ўжо даказана, што яно валодае бліскучым эфектам пры лячэнні анкалагічных захворванняў. Аднак яго шырокае прымяненне затрымліваецца, паколькі на нанаўзроўні пакуль не існуе дакладна вызначаных рэчаў. Ад дазіроўкі залежыць, будзе гэта вылечванне пухлін ці вырошчванне новых.

Нанасвет мае шырокія магчымасці. Розум, чым мы заўсёды ганарыліся, сёння можа вырабляцца штучна, мяжа паміж разумным і неразумным сціраецца.



Адным з праектаў, які ўсхваляваў усю навуковую грамадскасць, стаў праект маскоўскіх вучоных “Расія — 2045: на шляху да стварэння чалавека-машыны”. Ён шакіраваў сваёй смеласцю і выклікаў шмат пытанняў этычнага плана. Наколькі гэта патрэбна чалавецтву, якая мэта ў гэтых распрацовак? Самі навукоўцы фармулююць яе так: павелічэнне працягласці жыцця чалавека шляхам стварэння штучнага цела чалавека і пераносу ў яго свядомасці, якая мае вопыт пражывання ў біялагічным целе. Пры гэтым аўтары прызнаюцца, што іх вельмі захапляе тэхнічны бок справы, а яе этычны складнік застаецца па-за ўвагай.

Пытанне “А што далей?” і ёсць прадмет выхавання сучаснай экалагічнай культуры чалавека”.

## Тэму для навуковага даследавання можна знайсці… пад нагамі

Сёння ў Беларусі ва ўстановах дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі займаецца больш за 400 тысяч навучэнцаў. Кіруюць работай аб’яднанняў па інтарэсах больш за 900 педагогаў. Акрамя таго, эколага-біялагічны кірунак шырока развіты і ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі: падобныя аб’яднанні па інтарэсах маюць каля 60 працэнтаў сельскіх школ і 25 працэнтаў гарадскіх.

“Мы шмат увагі ўдзяляем стварэнню сеткі навуковых аб’яднанняў навучэнцаў і студэнтаў, якія займаюцца пытаннямі экалагічнага і біялагічнага характару, — адзначыла падчас канферэнцыі дырэктар Рэспубліканскага эколага-біялагічнага цэнтра Лідзія Паўлаўна Калiноўская. — За даныя мінулага года, у іх займалася больш за паўтары тысячы навучэнцаў. Нашы дзеці з поспехам прымаюць удзел у міжнародных алімпіядах. Напрыклад, у мінулым годзе абсалютнае “золата” атрымала работа з назвай “Ацэнка змяшчэння каштоўных біялагічна-актыўных рэчываў у насенні розных відаў фасолі”. Мы самі былі здзіўлены, што сярод той разнастайнасці тэм, якая звычайна прадстаўлена на міжнародным узроўні, гэтая работа аказалася на вышыні. Як бачыце, іншым разам самыя цікавыя і глыбокія тэмы можна знайсці літаральна пад нагамі. Дзякуючы нашым таленавітым дзецям, Беларусь ведаюць у 56 краінах свету”.

Разам з тым Лідзія Паўлаўна адзначыла, што ў найбліжэйшыя гады прадугледжана пашырэнне тэматыкі даследчых работ: эканомія прыродных рэсурсаў, энергія, біялагічная разнастайнасць, укараненне дасягненняў сучаснай навукі, у прыватнасці генетыкі і селекцыі, малекулярнай біялогіі.

На жаль, па-ранейшаму актуальнай у сістэме застаецца кадравая праблема. Педагогі прыходзяць працаваць ва ўстановы эколага-біялагічнага профілю, аднак часам не застаюцца ў іх надоўга. Яшчэ адной актуальнай праблемай, па словах дырэктара РЭБЦ, з’яўляецца захаванне і развіццё сеткі ўстаноў дадатковай экалагічнай адукацыі.

## Жыхары Пецярбурга хочуць бачыць сваіх дзяцей урачамі

Як аказалася, вельмі многія пытанні, якія абмяркоўваліся падчас канферэнцыі, аказаліся знаёмымі і расійскім калегам. І калі, напрыклад, кадравае пытанне хвалюе Эколага-біялагічны цэнтр “Крастоўскі востраў” у меншай ступені, то пытанні прафарыентацыі надзвычай актуальныя для абодвух бакоў.

“Калі раней асноўным заказчыкам



для нас з’явілася дзяржава, то сёння ўсё больш актыўную пазіцыю займаюць бацькі і самі навучэнцы, — адзначыў дырэктар ЭБЦ Артур Рэмавіч Ляндзберг. — Бацькі хочуць разумець, навошта дзіця наведвае той ці іншы калектыў, чаму яно навучыцца там, якія навыкі набудзе. Калі ў малодшым і сярэднім школьным узросце паняцце “цікава” па-ранейшаму значнае, то ў старшых класах назіраецца практычная прафесійная патрэба: што гэта дасць для будучай прафесіі.

Не так даўно ў Санкт-Пецярбургу было праведзена сацыялагічнае апытанне на тэму “Кім бы вы хацелі бачыць ваша дзіця ў будучыні?”. Цікава, што на першым месцы аказалася прафесія ўрача. А гэта значыць, што наша работа застанецца запатрабаванай яшчэ доўга”.

Нефармальна і крэатыўна падыходзяць расійскія педагогі да папулярызацыі сваёй дзейнасці. Традыцыйнымі для правядзення ў іх сталі выставы трапічных матылькоў, экскурсіі ў аранжарэю, заапарк, акварыумную гаспадарку, на інтэрактыўную выставачную экспазіцыю “Па слядах Сайруса Сміта” і інш. Вельмі запатрабаванымі з’яўляюцца тэматычныя заняткі ў лабараторыях гідрабіялогіі і арніталогіі, прыродных рэсурсаў і аграэкалогіі, якія праводзяцца па заяўках настаўнікаў біялогіі.

Агульным пытаннем як для расійскіх, так і для беларускіх педагогаў сталі новыя змяненні ў правілах атэстацыі работнікаў. А вось аўтарскія праграмы ў Санкт-Пецярбургу па-ранейшаму праходзяць атэстацыю ў рамках мясцовых метадычных саветаў.

Як адзначыла загадчыца аддзела ЭБЦ “Крастоўскі востраў” Ніна Якаўлеўна Машаткіна, сёння ў Расіі асаблівай папулярнасцю карыстаюцца шыракапрофільныя адукацыйныя праграмы работы з натуралістамі і эколагамі-краязнаўцамі пачатковага этапу, а таксама праграмы, якія звязаны з экспедыцыйнай работай юных біёлагаў і леснікоў. На другім месцы — аграбіялогія, флордызайн і экатурызм, а таксама маніторынгавыя даследаванні навакольнага асяроддзя. Радзей сустракаюцца праграмы, работа якіх заснавана на дзейнасці міні-заапарка або акварыумнай гаспадаркі, бо на іх не ў кожнай установе хапае сродкаў.

Завяршылася канферэнцыя семінарам па абмене практычным вопытам. Яго ўдзельнікі атрымалі магчымасць у нефармальнай абстаноўцы наладзіць кантакты і дамовіцца аб далейшых перспектывах у супрацоўніцтве.

**Наталля АЛЁХІНА.**
aliohina@ng-press.by